Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

Ніна
Баршчэўская
Варшава

Новыя тэндэнцыі ў беларускіх гаворках

New tendencies in Belarusian dialects

Праведзеныя на пачатку XXI ст. дыялекталагічныя даследаванні ў Беларусі ў параўнанні з данымі II паловы XX ст., з аднаго боку, паказваюць на захаванне шэрагу сістэмных з'яў, якія сведчаць пра безупыннасць развіцця беларускай дыялектнай сістэмы ды яе стабільнасць на даным гістарычным этапе, а з другога – на ўзнікненне новых тэндэнцый у беларускіх цэнтральных гаворках ды на памежжах Беларусі.

Вялікая варыянтнасць у выкарыстанні некаторых фанетычных, марфалагічных, лексічных і сінтаксічных сродкаў з'яўляецца доказам іх зменлівасці, несфарміраванага да канца характару паасобных частак сістэмы. Маем дачыненне са зменамі, якія адбываюцца на нашых вачах і падставай якіх не заўсёды з'яўляюцца ўнутрысістэмныя працэсы. У вялікай ступені выкліканы яны ўплывам суседніх гаворак (асабліва на памежжах Беларусі), на якія накладаецца дадаткова расійская мова на тэрыторыі цэлай краіны, дзе пераняла яна ўсе функцыі дзяржаўнае мовы.

Шматвяковая моўная мазаіка на беларускіх землях давяла да ўзнікнення білінгвальнай альбо полілінгвальнай моўнай супольнасці, што ўзмацняе інтэрферэнцыйныя працэсы на ўзроўнях *langue* і *parole*.

Беларускія гаворкі суседнічаюць з гаворкамі балцкімі, заходне- і ўсходнеславянскімі, утвараючы на памежжах палосы пераходных альбо мяшаных гаворак і штодзённа ўваходзячы ў новы кантакт на розных моўных і грамадскіх узроўнях.

Беручы пад увагу адметную сітуацыю ў цэнтральнай зоне ды ў зонах памежных, новыя тэндэнцыі ў беларускіх гаворках разглядаюцца ў наступнай паслядоўнасці: 1. новыя тэндэнцыі ў цэнтральнай беларускай зоне; 2. новыя тэндэнцыі ў гаворках на памежжах Беларусі.

1. Новыя тэндэнцыі ў цэнтральнай беларускай зоне

Цэнтральная зона беларускіх гаворак, якая аказала асаблівы ўплыў на працэсы нармалізацыі беларускае літаратурнае мовы, шырока прадстаўлена ў апрацаванай Інстытутам мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

і выдадзенай у 2009 годзе пад рэдакцыяй Любові Кунцэвіч і Веранікі Курцовай новай хрэстаматыі па беларускай дыялекталогіі.[1] Сабраныя ў ёй тэксты народнае мовы суправаджаюцца надрабязиам навуковым аналізам. Дыялекталагічныя даследаванні праводзіліся ў 1998–2008 гг. у 18 раёнах Менскай вобласці[2], 6 раёнах Гродзенскай вобласці[3] ды ў 1 раёне Магілёўскай вобласці[4], якія ўтвараюць цэнтральную дыялектную зону.

У хрэстаматыі апісаныя фанетычныя, марфалагічныя, лексічныя і сінтасічныя рысы ў параўнанні з ДАБМ[5] і ЛАБНГ.[6] Найменш падрабязна ахарактарызаваныя сінтаксічныя рысы, якім няшмат месца адведзена таксама ў ДАБМ і якія па сённяшні дзень найслабей даследаваныя ў беларускіх гаворках. Параўнанне з атласамі з 60-х і 90-х гадоў XX ст. дазволіла беларускім дыялектолагам сцвердзіць, што большасць сістэмных з'яў развіваецца бесперапынна, аднак выступаюць таксама пэўныя рысы, якія паказваюць на паяўленне новых тэндэнцый у беларускіх гаворках.

Цэнтральная дыялектная зона адыграла асаблівую ролю ў кадыфікацыі беларускае мовы. Дыялектныя рысы гэтае зоны маюць выразнае мясцовае паходжанне як вынік узаемаўлывяў і кантамінацыі асаблівасцяў з розных беларускіх гаворак, што знаходзяцца ў межах гэтае зоны, а не як рэзультат развіцця і выдзялення з іншых беларускіх гаворак у выніку кантактаў з гаворкамі суседняе мовы. Гэта прычынілася да таго, што сталіся яны падставай для агульнанацыянальнае працы над развіццём беларускае мовы.[7] Таму менавіта да іх адклікаўся Браніслаў Тарашкевіч, апрацоўваючы першую граматыку беларускае мовы.[8]

Цэнтральная дыялетная зона падзяляецца на 5 частак: раёны ваколіц Менска ды раёны напрамкаў: паўднёва-ўсходняга, паўднёва-заходняга, паўночнага і заходняга.

1.1. Раёны ваколіц Менска

У раёнах ваколіц Менска назіраецца:

• тэндэнцыя да ўніфікацыі структуры гукаў, да фанетычнай аднароднасці – неадрозніванне *а* і *е* ў апошнім адкрытым складзе ў месным склоне назоўнікаў адзіночнага ліку (*на л'авацца*, *у бал'оц'а, у х'ац'а*);

---

1 *Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі. Цэнтральная зона*, рэд. Л. П. Кунцэвіч, В. М. Курцова, Мінск 2009.

2 Раёны: Дзяржынскі, Менскі, Пухавіцкі, Смалявіцкі, Чэрвенскі, Капыльскі, Клецкі, Любанскі, Старадарожскі, Нясвіжскі, Стаўбцоўскі, Уздзенскі, Бярозаўскі, Крупскі, Лагойскі, Валожынскі, Вілейскі, Мядзельскі.

3 Раёны: Карэліцкі, Навагрудскі, Ваўкавыскі, Зэльвенскі, Слонімскі, Шчучынскі.

4 Асіповіцкі раён.

5 *Дыялекталагічны атлас беларускай мовы*, рэд. Р. І. Аванесаў, Мінск 1963.

6 *Лексічны атлас беларускіх народных гаворак*, т. 1–5, Мінск 1993–1998.

7 А. А. Крывіцкі, *Беларуская нацыянальная моватворчасць і сярэдняя (цэнтральная) зона беларускай мовы*, [у:] *Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі. Цэнтральная зона*, рэд. Л. П. Кунцэвіч, В. М. Курцова, Мінск 2009, с. 513.

8 Б. Тарашкевіч, *Беларуская граматыка для школ*, Вільня 1918.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

• шырокае і сталае выкарыстанне галоснага *о* ў некаторых асабовых формах дзеясловаў (*ізʼ'ом / ідʼом*), а таксама ў займенніках: асабовых (*йой*) і ўказальных (*той*), што аб'ядноўвае мясцовае вымаўленне з літаратурным;

• частая лабіялізацыя *а, ы* ў суседстве *ў, в, м* (*прʼоўда забрʼоў, поўднʼ'а, цʼэркоў, нучувʼац'; у жʼоўтум, на том*), якая аднак рэалізуецца нерэгулярна і непаслядоўна; вялікая варыянтнасць часта мае ідыялектны характар;

• наяўнасць падоўжаных зычных у інтэрвакальным становішчы (*насʼ'ен'нʼе, вʼосʼен'нʼу*), якім апошнім часам падпарадкоўваецца таксама лексіка, пазычаная з расійскае мовы (*аскарблʼ'ен'нʼе, саабраж'эн'нʼе, сабрʼан'нʼа, с пʼітʼан'нʼем*);

• пашырэнне прыстоўнага *в* не толькі перад *о* і *у* (*вʼозʼера, павʼук*), але таксама перад *а* (*у вагарʼот, у вʼармʼii*), нават у расійскай лексіцы (*трʼавур, вʼуксус*);

• уваход запазычанага *ф* у беларускую кансанантычную сістэму (*кʼуфар, фʼайна, картʼофлʼа*) і праяўленне яго ў расійскіх лексемах (*фтарʼога йанварʼа, фстрʼецʼіцца*); гэта прычыняецца да таго, што ранейшая замена *ф* зычнымі *п, х* сустракаецца спарадычна (*з кухрʼом, шупл'ʼады*);

• пашырэнне цекання і дзекання на запазычаную лексіку (*арц'ʼісты, цʼеʼатр, інсʼцʼітʼут, парцʼізʼаны*), што сведчыць пра адыход ад ранейшага спосабу рэалізацыі *т* і *д* перад галоснымі пярэдняга раду ў мясцовых гаворках і ў беларускай літаратурнай мове, ды паяўленне новай тэндэнцыі, згоднай з развіццём расійскае мовы;

• тэндэнцыя да змяншэння колькасці канчаткаў у назоўным склоне множнага ліку, якая заключаецца ў замене архаічных націсканых канчаткаў *-е, -а* тыповымі і часцей сустраканымі ў беларускіх гаворках канчаткамі *-ы, -і*; прычым архаічныя канчаткі часта выступаюць як дадатковыя побач дамінуючых *-ы, -і* (*абрʼусы, блʼінʼы; лʼісʼ'ічкʼі, пʼ'есʼнʼі; гнʼ'озды, вʼ'одры* ды *галаўкʼ'е, кулакʼ'е; дрʼова, крʼосна*); такая адвольнасць у выкарыстанні аднаго канчатка з некалькіх магчымых сведчыць, з аднаго боку, аб незавершаным працэсе фарміравання новай лексічнай сістэмы, а з другога – аб працягласці мясцовай дыялектнай традыцыі;

• выразная экспансія канчаткаў *-ʼоў, -аў* у родным склоне множнага ліку не толькі назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду, але таксама назоўнікаў жаночага роду I скланення (*грыбʼоў, прʼаўнукаў; грʼупау, крынʼіцаў, нʼавʼ'естаў*), што можа сведчыць пра дамінацыю мужчынскага роду;

• лексічныя русізмы, дастасаваныя да беларускага вымаўлення (*апрыʒʼалʼ'ацʼ*, *абрашчʼацца, даўлʼ'енʼнʼе, інʼцʼарʼесна, прʼазʼнʼік, укʼусʼнʼенʼкае*).[9]

1.2. Раёны паўднёва-ўсходняга напрамку

У раёнах паўднёва-ўсходняга напрамку заўважаюцца тэндэнцыі, якія часткова супадаюць з апісанымі вышэй зменамі, характэрнымі для ваколіц Менска, а менавіта:

• частая лабіялізацыя галосных *а, ы* ў суседстве губных зычных;

[9] Прыклады пачэрпнутыя з: *Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі…*, с. 104–118.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

• шырокае і сталае выкарыстанне галоснага *о* ў некаторых асабовых дзеяслоўных формах *(жыв'ом, уц'ак'айом*);

• экспансія канчаткаў *-'оў, -аў* у родным склоне множнага ліку не толькі назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду, але таксама назоўнікаў жаночага роду;

• лексічныя русізмы, дастасаваныя да беларускага вымаўлення.

Выступаюць таксама рысы, якія адрозніваюць абодва раёны, напрыклад:

• тэндэнцыя да дамінацыі двухскладовага канчатка ў творным склоне назоўнікаў і прыметнікаў, а таксама асабовых і ўказальных займеннікаў жаночага роду адзіночнага ліку (*х'атайу, малад'ойу, й'ойу, т'ойу / т'эйу*); аднаскладовы канчатак мае статус факультатыўнага *(ж'оўтай*).[10]

1.3. Раёны паўднёва-заходняга напрамку

У раёнах паўднёва-заходняга напрамку таксама выступаюць некаторыя тэндэнцыі, характэрныя для раёнаў ваколіц Менска, напрыклад:

• сільная тэндэнцыя да выкарыстання супольных для трох родаў назоўнікаў канчаткаў назоўнага склону множнага ліку *-ы, -і* паралельна са старым канчаткам *-е* (*грыб'ы / грыб'е, в'анк''і / в'анк''е*);

• лексічныя русізмы, дастасаваныя да беларускага вымаўлення.

Гэтаму раёну характэрная вялікая варыянтнасць скланяльных і спрагальных формаў, што сведчыць пра захаванне мясцовай дыялектнай традыцыі. Аднак пачынае прабівацца тэндэнцыя да уніфікацыі некаторых з іх.[11]

1.4. Раёны паўночнага напрамку

У раёнах паўночнага напрамку таксама заўважаюцца ўніфікацыйныя тэндэнцыі, напрыклад:

• пашырэнне галоснага *а*, выкліканае рознымі прычынамі: асіміляцыяй (*падам'ал'і ≤ падым'ал'і, пат'айц'ес'а ≤ пыт'айц'ес'а*); наяўнасцю суфікса *-ава* замест *-ва* (*раск'азавала / раск'азвала, с'ц''агаваў / с'ц''агваў*), які ў гэтых гаворках з'яўляецца прадуктыўным; імкненне да фанетычнага выраўноўвання структуры слова, што праяўляецца ў рэалізацыі *а* ў апошнім адкрытым складзе і вынікае не толькі з акання і якання (*к'ажа, р'оўна, ус''акага*; *у л''ес'а, у х'ац'а*), але таксама выступае замест *-ы* (*у х'ацца ≤ у х'атцы, па р'эцца ≤ па р'эчцы*); дэлабіялізацыяй *у ≥ а* ў канчатку *-ую* (*н'овайу х'ату ≤ н'овуйу х'ату*);

• паслядоўнае выкарыстанне канчатка *-уць* у 3 асобе адзіночнага ліку незалежна ад спражэння (*м'ыйуцца, нар'ежуц', с''ейуц', зал'ійу'уц'* – I спражэнне; *нав'аруц', ст'ав'уц', х'оʒ'уц' знак'ом'уцца* – II спражэнне) – ДАБМ прыводзіць паралельна формы (*к'орм'ац', н'ос'ац', х'оʒ'ац' / к'орм'уц', н'ос'уц', х'оʒ'уц'*).[12]

Выступае таксама шэраг з'яў, якія аб'ядноўваюць гэты раён з папярэднімі, напрыклад:

[10] *Ibid.*, с. 176–191.
[11] *Ibid.*, с. 296–301.
[12] ДАБМ, карта 157.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

• экспансія канчаткаў *-'оў, -аў* у родным склоне множнага ліку не толькі назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду, але таксама назоўнікаў жаночага роду;

• наяўнасць прыстаўных зычных *в, г*;

• паслядоўнае выкарыстанне *ф* у запазычанай лексіцы;

• пашырэнне дзекання і цекання на запазычаную лексіку; сведчыць гэта пра набліжэнне дыялектнага вымаўлення да расійскага ўзору і адыход ад беларускага літаратурнага вымаўлення, што выклікана адсутнасцю беларускае літаратурнае мовы ў грамадскім жыцці;

• лексічныя русізмы, прыстасаваныя да беларускага вымаўлення – уплыў расійскае мовы значны і заўважальны ў гаворках, але пакуль не вырашае пра іх характар і развіццё.[13]

1.5. Раёны заходняга напрамку

У раёнах заходняга напрамку выступаюць:

• вельмі характэрная для гэтай гаворкі тэндэнцыя да стабілізацыі сцягнутых формаў (*п'ол'ску шк'олу, ц'элу п'еч*), што праяўляецца таксама ў экспансіі працэсу сцяжэння на запазычаную лексіку, у тым ліку з расійскае мовы (*п'ен'с'а, іскл'уч'ен'а, зайаўл''ен'а*);

• адсутнасць падаўжэння зычных не толькі ў інтэрвакальным становішчы (*куц''а, нас''ен'а, зб'ожа*), але таксама на мяжы марфемаў, у тым ліку ў расійскіх лексемах (*адай'у йам'у, з'ерав''аны, пл''еныйа, увабр'аца, вуч'ыца*).

Варыянтнасць розных формаў сведчыць аб працэсе парадкавання фанетычнай сістэмы данай гаворкі і гэтым самым пра яе інавацыйны храналагічны тып.[14]

2. Новыя тэндэнцыі ў гаворках на памежжах Беларусі

2.1. Польска-беларуска-літоўскае памежжа

Дыялектны матэрыял, сабраны ў Беларусі падчас тэрытарыяльных даследаванняў на польска-беларуска-літоўскім памежжы, сведчыць пра часцейшую наяўнасць моўнай канвергенцыі, чым дывергенцыі. Адчуванне дыферэнцыяцыі ў маўленні па-польску і „па-просту", г.зн. беларускай гаворкай, заціраецца. Пераважае свядомасць „мяшанай мовы" як асноўнага сродку моўнае камунікацыі, незалежна ад таго, якой моўнай сістэмай карыстаецца ў даны момант білінгвальнае насельніцтва. З мовазнаўчага пункту погляду важна вызначыць, ці гэтае „мяшанае маўленне" захоўвае сістэмны характар польскае мовы, ці беларускае на працягу пакалення.[15]

[13] Прыклады пачэрпнутыя з: *Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі…*, с. 377–390.

[14] *Ibid.*, с. 493–503.

[15] E. Smułkowa, *Badanie pograniczy językowych – uwagi metodologiczne*, „Gwary dziś" 2, *Regionalne słowniki i atlasy gwarowe*, Poznań 2003, c. 53.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

Зразумела, трэба ўлічваць таксама ўплыў на дыялектную сістэму расійскае мовы, якая карыстаецца ў беларускім грамадстве вялікім прэстыжам, што ў многіх выпадках вядзе да ўзнікнення „трасянкі".[16]

Эльжбета Смулкова звяртае ўвагу на моўную разнароднасць на польска-беларуска-літоўскім памежжы, таму што іншая сітуацыя выступае, напрыклад, у ваколіцах Салечнік, іншая на Браслаўшчыне, і яшчэ іншая ў ваколіцах Ліды і Навагрудка. Гэта датычыць, між іншым, ступені валодання польскай мовай ды колькасці ў ёй літуанізмаў, беларусізмаў і інш., а таксама ўплыву і ролі суседніх моў (гаворак) у мясцовай беларушчыне.

На Браслаўшчыне маем дачыненне з вялікімі ўзаемаўплывамі славянскіх моў, насычаных балцкімі элементамі, а таксама з вялікім узроўнем славізацыі літоўскіх гаворак, што можна гаварыць пра канвергенцыю (інтэграцыю) мясцовых моў, зразумелых для іх карыстальнікаў, асабліва сярод старэйшага пакалення.[17]

Гэта абумоўлена:

• ранейшымі працяглымі інтэрферэнцыйнымі працэсамі, якія прычыніліся да моўнае інтэграцыі;

• сістэмнай блізкасцю, якая ўздзейнічае на ўзаемаразуменне, а таксама ўсведамленнем адпаведных фанетычных субстытуцый, напрыклад: бел. паўнагалоссе (*кар'ова*, *малак'о*) – польск. адсутнасць паўнагалосся (*krova*, *mleko*); бел. *l* эпентычнае (рабл*''у*, *спл'у*) – польск. адсутнасць *l* эпентычнага (*robię*, *śpię*); бел. *р* (*рак'а*, *р'ама*) – польск. *rz: r* (*rzeka*, *rama*); бел. адсутнасць насавых галосных (*в'усы*, *спл'у*) – польск. іх наяўнасць (*wąsy*, *śpię*); лексемы супольныя для абедзвюх моў з аднолькавым націскам (*к'аша*, *к'ом'ін*, *л''іпа*, *л'апа*), альбо з розным месцам націску (*дыв'ан* – *d'yvan*, *в'ін'о* – *v́'ino*), якому спадарожнічаюць змены ў рэалізацыі ненаціскных галосных, як аканне (*вад'а* – *v'oda*), яканне (*б'ад'а* – *b́'eda*), звужэнне галосных *о* ≥ *и* і *е* ≥ *і* (*хаʒ'іл'і* – *хиʒ'il'i*, *pii̯'ali* 'спявалі'); аднакарэнныя лексемы, з падобнай марфалагічнай будовай (*д'ом'ік* – *domek*, *кас''ілка* – *koś'arka*);

• звужэннем сфер выкарыстання мясцовае польскае мовы, што ўплывае на змяншэнне моўнае кампетэнцыі;

• адабрэннем расійскае мовы ў якасці асноўнага сродку камунікацыі, на што паўплывалі гістарычныя грамадска-палітычныя ўмовы, прэстыж мовы ды актуальная моўная палітыка дзяржавы[18];

Канвергенцыя закранае ўсе моўныя ўзроўні[19]:

Фанетычны:

• літоўскае спрашчэнне падвоеных зычных у беларускай гаворцы (*нап''іца*, *с'м''аца*, *пай'ехаў к'она*) і ў польскай (*ona povina*, *był rany*, *po kavałkax odaval'i*);

---

16 *Ibidem.*

17 E. Smułkowa, *Integracja języków na pograniczu białorusko-polsko-litewskim i jej konsekwencje dla teorii zapożyczeń*, „Biuletyn Polskiego Towarzystwa Językoznawczego", z. 66, Kraków 2010, c. 102.

18 *Ibidem.*

19 *Ibid.*, c. 102–105.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

• беларускія палаталізаваныя *с”, з”, ц”, ʒ”* у некаторых дыялектах вымаўляюцца як палатальныя;

• дынамічны характар націску выклікае даўжэйшае вымаўленне націскнога галоснага і прычыняецца да зменаў у рэалізацыі ненаціскных галосных, як: аканне, яканне, звужэнне галосных.[20]

Марфалагічны:

• выкарыстанне польскіх канчаткаў ва ўсходнеславянскай лексіцы (*a tu troxa muśi popada* ≤ рос. *попад'aет* ‘пападае, трапляе’);

• супадзенне граматычнага роду назоўнікаў (польск. *chomont* м ‘chomąto’ н – бел. *хам'ут* м; *ščura vodna* ж – магчыма, пад уздзеяннем *м'ыша* ж); фемінізацыя назоўнікаў ніякага роду з увагі на акаючыя формы ў назоўным склоне множнага ліку (*bagna – po teį bagńe*, *błota – po teį błoc'e*);

• аднолькавы літоўскі ўплыў на беларускія і польскія гаворкі ў выкарыстанні дзеепрыслоўяў на *-ўшы* ў сінтаксічнай функцыі выказніка (бел. *тр'ец'і быў аст'аўшыс'а*, *йа был'а с'уд'ы прыв''ошы*; польск. *ja mało uczywszy się*, *jak urodziwszy się tak przyzwyczajony*);

• формы найвышэйшае ступені прыметнікаў і прыслоўяў у польскай мове ўтвораныя згодна з беларускай мовай (*s'amy d'obry*, *s'amy st'aršy*, *s'ama v'encyį* ‘найбольш’).

Лексічны:

• змешванне лексемаў з розных моўных кодаў – лексемы літоўскага паходжання, якія выступаюць у беларускіх і польскіх тэкстах, ахопліваюць крыху шырэйшую тэрыторыю ў беларускіх гаворках (*б'онда*, *дырв'ан*, *кр'ушн'а*, *кумп'ак*);

• усведамленне вялікай колькасці супольных лексемаў альбо з нязначнымі семантычнымі адрозненнямі спрыяе канвергенцыйным працэсам: польска-беларускаму (*йон так''і раз'ʒ'ал''оны* ‘пра капыт каровы’ – польск. *raz'ʒ'al''ony*, бел. *раз'ʒ''ел'ены*, хаця магчымыя націскныя ваганні ў дзеепрыметніках (*с'ушаны – суш'оны*, напрыклад: *суш'оны л'іст*), якія спрыяюць пераходу іх у катэгорыю прыметнікаў; польска-беларуска-расійскаму (*kar'ova pševrac'aįe s'e v byka* ≤ рас. *пр'евращ''ат'с'а* ‘пераўтварацца ў нешта, у кагосьці’);

• семантычныя змены, выкліканыя пераносам расійскіх альбо беларускіх значэнняў на падобныя ў гучанні польскія лексемы (*ona taka porządna, na nią położyć się można*, дзе *położyć się* ≤ рас. *положит'с'а* ‘мець давер’; *ustroiliśmy dom* ‘пабудавалі’ ≤ рас. *постр'оит'*, польск. *ustroić* ‘упрыгожыць; польск. *spętany język* ≤ бел. *п'утаны яз'ык* ‘мяшаны’ – *i ot takie pętaniny zrobili się* ‘мяшаныя людзі’)[21];

• субстытуцыя найбольш яркіх фанетычных рыс польскае мовы ў беларускай лексіцы (*ʒ'omp – dziąb / ʒ'emba – dzięba* ж ≤ бел. *ʒ''уба*; *kęsty* ≤ бел. *куст'ы*; *tęcza* ‘хмара’ ≤ рас. *т'уча*).

[20] Гл. вышэй пункт аб блізкароднасных мовах.

[21] Гл. шырэй: E. Smułkowa, *Spentany jenzyk, czyli o substytucjach i kalkach na pograniczu językowym*, „Acta Baltico-Slavica” 31, s. 283–289.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

Цікавым прыкладам адлюстравання балцкага субстрату альбо старой інфільтрацыі з'яўляецца літуанізм *к'удра* 'густы лес на балоце', наяўны ў беларускай гаворцы вёскі Гервяты Варанецкага раёна, які ўваходзіць у семантычную апазіцыю з лексемай *бор* 'лес на ўзвышшы' паводле дыферэнцыяльнае рысы 'размяшчэнне'. Лексема *к'удра* і яе вытворныя (мікратапонімы *кудр'аўка*, *кудр'еп'ік*, *куӡ''ерка*) выступаюць на заходніх і паўночных землях Беларусі. Аказваецца, што лексема *кудр'авы*, якая выступае ў беларускай літаратурнай мове, не заўсёды мае значэнне 'з пакручанымі валасамі' і можа акрэсліваць 'густы падмоклы лес".[22]

Э. Смулкова заўважыла дзве рэгулярнасці, характэрныя білінгвальнаму насельніцтву на заходніх тэрыторыях Беларусі:

1. Старая тэрміналагічная лексіка з галіны сельскай гаспадаркі, традыцыйнай медыцыиа, даўніх будынкаў, посуду і страў – гэта ў асноўным беларуская лексіка, часам толькі крыху адаптаваная да польскага вымаўлення.

2. Частка лексікі, якая фанічна поўнасцю адпавядае польскай марфаналагічнай структуры слова, таксама не заўсёды сыходзіць з польскае мовы, а з'яўляецца мясцовай транспазіцыяй беларускіх альбо расійскіх лексемаў у польскім тэксце. У гэтай лексічнай групе асаблівае месца займаюць амафоны – лексемы, якія ў польскай і беларускай мовах гучаць аднолькава, але маюць іншае значэнне.[23]

В. Гушчава звяртае ўвагу на факт, што адсутнасць імкнення да размежавання дзвюх розных моўных сістэмаў закранае ў асноўным беларускую і расійскую мовы. Некаторыя русізмы выступаюць у беларускім гучанні. Іх выкарыстанне часта не вынікае з няведання беларускага слова, але выклікана прэстыжам расійскае мовы, якая ўвесь час асацыюецца з грамадскім авансам. Найслабей расійскай мовай валодае найстарэйшае пакаленне, а для моладзі яна часта з'яўляецца першай мовай. Нават калі б сітуацыя беларускае мовы ў Рэспубліцы Беларусь палепшылася, то хутчэй за ўсё на карысць літаратурнае мовы, а не гаворкі, у якой назіраюцца істотныя змены.[24]

Даследчыкі Браслаўшчыны, аналізуючы працэсы канвергенцыі на багатым матэрыяле выказванняў жыхароў, заўважалі індывідуальныя рысы (ідыялектнасць) ды інавацыі, якія паўтараліся ў выказваннях некалькіх жыхароў. Гэтыя інавацыі ўвайшлі ўжо ў моўныя сістэмы, якімі карыстаецца насельніцтва гэтага памежжа.[25]

На польска-беларускім памежжы на Падляшшы таксама заўважаюцца працэсы, якія інтэгруюць беларускамоўнае насельніцтва з польскамоўным. Сярод найважнейшых інтэграцыйных чыннікаў Э. Смулкова выдзяляе:

[22] Eadem, *Białoruskie kudr'avy to nie zawsze 'kędzierzawy'*, „Acta Baltico-Slavica" 14, 1981, c. 244.

[23] Eadem, *Spentany jenzyk, czyli o substytucjach i kalkach…*, c. 283.

[24] O. Guszczewa, *Zakres użycia języka rosyjskiego i jego oddziaływanie na gwary białoruskie i polszczyznę w rejonie brasławskim*, [w:] *Brasławszczyzna. Pamięć i współczesność*, t. 1, Warszawa 2011, c. 231–245.

[25] E. Smułkowa, *Sytuacja socjolingwistyczna i proces konwergencji języków na Brasławszczyźnie w świetle badań terenowych (1997–2007)*, [w:] *Brasławszczyzna…*, c. 122.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

• адукацыю і працу ў горадзе, што вядзе да паглыблення ведаў агульнапольскае мовы ды росту яе прэстыжу ў грамадстве, а гэта ў сваю чаргу спрыяе грамадскаму авансу;

• каталіцкае веравызнанне, якое атаясамліваецца з польскасцю; у сваю чаргу праваслаўе дэзынтэгруе, спрыяе захаванню нацыянальнае адметнасці, што можа прычыняцца да захавання роднае мовы;

• супрацоўніцтва і прыстасаванне; найчасцейшай формай прыстасавання з'яўляецца акамадацыя – талерантнасць, спалучаная з саступкамі, якая спрыяе ўзнікненню супольных каштоўнасцяў і нормаў (напрыклад, суіснаванне на Падляшшы дзвюх сістэмаў: польскай і беларускай, ці польскай і літоўскай, іх паступовае збліжэнне і заменнае выкарыстанне кодаў, значыць, двухмоўе, а таксама інтэрферэнцыя, якая разумеецца як працэс і вынік гэтага працэсу); у сваю чаргу асіміляцыя вядзе да адыходу ад сваіх прынцыпаў і нормаў ды прыняцця новых (свядомы адыход часткі грамадства ад беларускай сістэмы на карысць рэгіянальнага альбо агульнага варыянту польскае мовы), што вядзе да занікання адной сістэмы на карысць другой і моналінгвізму; залежнасць паміж ступенню авалодання польскай мовай усходнеславянскім насельніцтвам і аб'ёмам інтэрферэнцыі вынікае з: умення свабоднага пераключэння моўных кодаў (вынікі інтэрферэнцыі зводзяцца да наяўнасці беларускіх рысаў у польскай мове і польскіх у беларускай) альбо выкарыстання мяшанага коду, калі заўважаецца імкненне гаварыць па-польску, але працэс мыслення праходзіць на роднай гаворцы.[26]

Уплыў адной мовы (дыялекту, гаворкі) на другую найчасцей назіраецца на ўзроўні лексікі. Некаторыя лексемы прыжываюцца ў суседняй гаворцы. Тады няраз заўважаюцца змены ў вымаўленні блізкіх сістэмна і тэрытарыяльна моў (дыялектаў, гаворак). Запазычанні ўваходзяць у лексіка-семантычную сістэму гаворкі і выклікаюць змены на паасобных узроўнях (лексічным, семантычным, марфалагічным, фанетычным), ствараючы аднак дыялектную сістэму дастаткова празрыстую. Уплыў польскае мовы на беларускую дыялектную сістэму заўважаецца перш за ўсё ў лексіцы, значыць, лексемы інфільтруюць хутчэй за рысы фанетычныя ці марфалагічныя. У беларускіх гаворках даследаваных мясцовасцяў (Баброўнікі, Хамэнтоўцы, Сакаляны, Козлікі, Войшкі) у тэме, звязанай з нараджэннем чалавека, выступаюць, між іншым, наступныя паланізмы: *c'onža, ʒ'ecko, kab'ety, porodova (bapka)*. Немалое значэнне маюць экстралінгвістычныя чыннікі (радыё, тэлебаганне, прэса, школы), якія спрыяюць хутчэйшай інфільтрацыі лексемаў з польскае мовы ў беларускія гаворкі.[27]

Польска-беларуска-літоўскія моўныя сувязі вельмі выразна назіраюцца ў мікратапаніміі земляў паўночна-ўсходняе Польшчы, дзе падзел назваў паводле моўнае прыналежнасці прадстаўляецца наступным чынам:

[26] *Ibid.*, c. 400–404.

[27] N. Barszczewska, *Białoruski system gwarowy pięciu wsi na Białostocczyźnie (na materiale leksykalnym związanym z narodzinami dziecka*, [w:] *W kręgu kultury białoruskiej*, Olsztyn 1994, c. 159–186.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

• дыялектныя беларускія назвы (*Bar'ok, Har'a, Hl''in'išča, L'as'ok*);
• дыялектныя ўкраінскія назвы (*Bud'yska, Ozer'eć, Per'elisky, Pyńk'y*);
• дыялектныя польскія назвы (*Jeľ'ufka, Sf'yn'ak, T'erta G'ora*);
• дыялектныя літоўскія назвы (*Alksn'ynas, Bagotasał'a, Łap'ak'alńis*);
• нешматлікія расійскія назвы (*Skavar'otka, T'očka, Vadak'ačka*).[28]

Асабліва цікавыя гібрыдныя назвы, якія не дазваляюць адназначна кваліфікаваць даную лексему да адной мовы.

Фанетычныя гібрыды:
• беларуска-ўкраінскія (*Horaʒ''iska, Verxkryn''ica, Zver'yn'ec*);
• беларуска-польскія (*C'imoxov''izna, Ž'ab'a Har'a, Žond'ovy L'es*);
• украінска-польскія (*Napš'eciv Sel''isek, Telatycc'yzna*);
• літоўска-ўсходнеславянскія (*Šl'in'ok, Trak''ali, Trak''el'*).

Словаўтваральныя гібрыды:
• польская аснова + ўсходнеславянскі фармант (*Pod Głemb'očynaj*);
• усходнеславянская аснова + польскі фармант (*Daraγušč'yzna, P'atn'asty, -aγo, -um*).

Кампанаваныя назвы:
• сярод кампанаваных назваў значны працэнт складаюць тыя, у якіх кожная лексема паходіць з іншае мовы; у родным склоне маюць яны розныя канчаткі: польскія (*P'eršy Pol''etek, -ego -tka*, *Skarʒ'uk'oų Grond, -ov'ego -u; Zaz'ul'in Grond, -'ego -u*), беларускія (*Čt'ery Zah'ony, -a -uų, -y -ax; Popr'ečn'i Roų, -'aγo -va*) альбо кожны з кампанентаў захоўвае канчатак, характэрны той мове, з якой паходзіць (*P'ęc' Zah'ony, -'u -ov*).[29]

2.2. Беларуска-латышскае памежжа

Асобы, народжаныя да вайны ў савецкай частцы Беларусі ды ў Латвіі – тыя, хто хадзіў у беларускія школы ў Краслаўкім раёне, ведаюць падставы беларускае мовы, аднак не карыстаюцца ёю ў штодзённым жыцці. Асобы сярэдняга пакалення, прыбылыя ў Латвію з Заходняй і Ўсходняй Беларусі, даволі добра валодаюць беларускай мовай, таму што вывучалі яе ў беларускіх школах, аднак для іх беларуская мова не з'яўляецца першай мовай. Наймаладзейшае пакаленне ўвогуле не ведае беларускае мовы, таму што ў Латвіі няма беларускіх школ.[30]

[28] N. Barszczewska, J. Głuszkowska, T. Jasińska, *Polsko-wschodniosłowiańskie związki językowe w mikrotoponimii północno-wschodniej Polski* [w:] *Badania dialektów i onomastyki na pograniczu polsko-wschodniosłowiańskim*, Białystok 1995, c. 205.

[29] *Ibid.*, c. 206, 209. Гл. таксама: N. Barszczewska, J. Głuszkowska, *Gwarowe zjawiska językowe w odliczebnikowych nazwach terenowych na wschodniej Białostocczyźnie,* „Rozprawy Slawityczne" 7, Lublin 1993, c. 49–62; N. Barszczewska, J. Głuszkowska, N. Kolis, T. Jasińska, E. Smułkowa, *Elementy bałtyckie i wschodniosłowiańskie w przygotowywanym Słowniku nazw terenowych północno-wschodniej Polski*, „Acta Universitatis Lodziensis. Folia Linguistica", t. 27, 1993, c. 3–8.

[30] M. Jankowiak, *Gwary białoruskie na Łotwie w rejonie krasławskim*, Warszawa 2009, c. 43–44.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

Беларускія гаворкі прысутныя перш за ўсё ў сямейна-суседскай сферы. У сферы адукацыі маладыя беларусы маюць магчымасць вывучаць толькі прадмет „родная культура" ў расійскай школе ў Краславе, дзе знаёмяцца з падставамі беларускае мовы, а таксама з культурай і гісторыяй Беларусі. Беларуская гаворка і беларуская літаратурная мова прысутныя ў рэлігійнай сферы; беларуская літаратурная мова – таксама ў сродках масавай інфармацыі.[31]

Ва ўмовах суіснавання дзвюх усходнеславянскіх моў – беларускай і расійскай – непазбежная інтэрферэнцыя на розных моўных узроўнях.[32]

На фанетычным узроўні заўважаецца часам:

• замена характэрнага для беларускае мовы фрыкатыўнага *г* тыповым для расійскае мовы выбухным *г'* (*гавар'у, г'оніц' самаг'онку, разгав'арывайец'; друг'ойе, маг'аз''ін, стр'ог'а, разг'ав'ар'івайу*); аднак гэта не паўсюдная з'ява і вагаецца яна ў межах 7–8%.

• паралельнае выкарыстанне *ў / л, в*, прычым вымаўленне *ў* дамінуе ва ўсіх групах латышскіх беларусаў, якія карыстаюцца беларускай мовай (*быў, кл'асаў, хац''еў, жан''іўс'а; Гарбач'ов, л'уб'ов; был, п'ераш'ол, прыйажǯ'ал*); адсотак вымаўлення *в* адносна *ў* складае 5% сярод беларусаў, якія прыбылі з Заходняй Беларусі і 9 % сярод аўтахтонаў;

• паралельнае выкарыстанне *р / р'* на месцы *р'*, але толькі ў расійскай лексіцы, што пацвярджае тэзу пра зацвярдзелае р на тэрыторыі Мёршчыны і Браслаўшчыны (*ǯ'ар'эўн'а, крапч'ейшыйа, пасматр'эў, р'эчкай; напр'ім''ер, пр'ішл'ос'а*); значна часцей *р'* выступае ў маўленні латышскіх беларусаў (33,5%), чым у маўленні беларусаў, прыбылых з Заходняй Беларусі (11%);

• частае выкарыстанне лексемаў без палаталізацыі заднеязычных *к, г, х // ц, з', с'* – гэта адна з найбольш яркіх рыс, якія адрозніваюць беларускую мову ад расійскай (*на бум'ашк'е, па дар'ог'е, у Р'ыг'е; у руц'э, па дар'оз'е, у Р'ыз'і*); формы з палаталізацыяй выступаюць вельмі рэдка, як у маўленні прыезджых, так і мясцовых беларусаў[33];

• паўсюднай рысай гаворак паўночна-ўсходняй Беларусі і Краслаўскага раёна з'яўляецца канцавы *-ць* у 3 асобе адзіночнага ліку дзеясловаў I спражэння, характэрны для дзеясловаў II спражэння, значыць, назіраецца ўніфікацыя канчатка (*ак'учваец', буш'уец', прыежǯ'аец', саабшча'ец'*); беларускія дыялектныя формы выступаюць значна часцей за расійскія тыпу *зн'ает, б'уǯ'ет*;

• пашырэнне дзеепрыслоўных формаў на *-ўшы* пад уздзеяннем балцкіх моў (*йа дахаǯ''іўшы, йа раǯ''іўшыс'а, у м'ан''е сахран''іўшыс'а*); выступаюць у маўленні мясцовых беларусаў і прыезджых з Мёрскага і Браслаўскага раёнаў;

• значная ступень русіфікацыі лексікі ў маўленні мясцовых беларусаў і прыезджых з Беларусі (*акц''абр* – бел. *кастр'ычн'ік*, *баль'н'ы* – бел. *хв'оры*, *хаз''аін* – бел. *гаспад'ар*, *вр''ем'а* – бел. *час*) – расійская лексіка датычыць не толькі тэр-

[31] *Ibid.*, с. 120–123.
[32] *Ibid.*, с. 138–168.
[33] *Ibid.*, с. 148.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

міналогіі, звязанай з калгасным і саўгасным жыццём ці з прамысловасцю, але таксама лексікі з такіх галін жыцця, як традыцыйная сельская гаспадарка, ткацтва ці сямейныя адносіны.[34]

Праведзены тэрытарыяльныя даследаванні ў 26 мясцовасцях на памежжы з Беларуссю пацвердзілі, што беларускія гаворкі ў Краслаўскім раёне – гэта працяг паўночна-ўсходняга дыялекту. У фанетыцы і флексіі захоўваецца іх беларускі характар, пра што сведчыць дамінацыя вышэй названых рысаў, аднак заўважаецца данамікя русіфікацыі. Мяшаны характар фанетыкі і флексіі пераважае ў маўленні латышскіх беларусаў.[35]

Варта нагадаць, што гэта тэрыторыя, якая на ранейшых картах залічалася да масіву беларускіх гаворак як Я. Карскім (*Этнографическая карта белорусского племени*, 1903), так і Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй (*Диалектологическая карта русского языка в Европе*, 1914). Таксама іншыя карты з канца XIX – пачатку XX ст., падрыхтаваныя А. Рыціхам (1875), М. Доўнар-Запольскім (1919) ахопліваюць памежныя тэрыторыі Латвіі ўключна з Даўгаўпілсам. Толькі мяжа, вызначаная Р. фон Эркертам (1863), праходзіць на ўсход ад сённяшняй дзяржаўнай мяжы – праз Браслаў.

2.3. Беларуска-расійскае памежжа

Беларуска-расійскае памежжа было добра апісанае ў першай палове XX ст. даследчыкам Смаленшчыны П. Растаргуевым. Сёння беларускія дыялектолагі найчасцей не перасякаюць межаў Беларусі і не даследуюць гаворак Смаленшчыны і Браншчыны, баючыся, каб іх не абвінавацілі ў нацыяналізме.[36]

Тым часам падыход да гэтых гаворак расійскіх дыялектолагаў цалкам адрозны. Сёння расійскія лінгвісты не працягваюць поглядаў на бранска-смаленскія гаворкі сваіх папярэднікаў з пералому XIX і XX стст., якія адназначна залічалі іх да беларускага „нарэчча". Пераходныя беларуска-расійскія гаворкі выступаюць на ўсход ад іх, аб чым выразна сведчаць ізаглосы на картах расійскае мовы. Апіраючыся на працы дарэвалюцыйных расійскіх вучоных і сучасныя даныя, Г. Цыхун сцвярджае, што нельга сумнявацца ў беларускай аснове паўднёвапскоўскіх, заходнесмаленскіх і заходнебранскіх гаворак.[37]

Таксама насельніцтва ўсходняе Беларусі (даследаванні вяліся на ўсходняй Магілёўшчыне) заўважае адзінства са Смаленшчынай: „*Там за намі начінаецца ужо Расія. Там счітаецца ужо расіяне. Онэ такэя самыя як і мы, токо што зовуцца расіяне. А чэго-жэ? Такэя самыя людзі як і мы. І таксамо гавораць як і мы.*

[34] *Ibid*., с. 158.
[35] *Ibid*., с. 169–170.
[36] Г.А. Цыхун, *Заметки о говорах и диалектных чертах белорусско-русского пограничья,* [у:] A. Bolek, A. Fałowski, *Słowianie wschodni. Między językiem a kulturą*, Kraków 1997, с. 218–219.
[37] *Ibid*., с. 221–225.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

[…] *Там у Смаленшчыне, таксамо як і мы*".[38] Э. Смулкова адзначае, што беларуска-расійскае памежжа намінальнае, таму што ўвядзенне дзяржаўнай мяжы пасля распаду СССР прычынілася да ўзнікнення тэрытарыяльнай апазіцыі: тут Беларусь – там Расія. Тут жывуць беларусы – там расіяне, але гэтае намінальнае адрозненне не нясе за сабою фактычнай адметнасці, а наадварот – падкрэсліваецца адзінства даследаванае тэрыторыі са Смаленшчынай.[39]

На Магілёўшчыне, падобным чынам як на захадзе Беларусі, людзі сваю гаворку акрэсліваюць „мяшанай", таму што заўважаюць наяўнасць лексікі з расійскае мовы. Гэта аднак змешваюцца не дзве літаратурныя мовы, а толькі мовы асоб, паміж якімі выступаюць узаемаадносіны, г.зн. расійскамоўных прадстаўнікоў маладога пакалення, якое жыве ў горадзе, але не страціла кантакту з вёскай, ды беларускамоўных жыхароў беларускай вёскі – найчасцей гэта людзі пажылога ўзросту. Згэтуль выснова, што ў „мяшанай" мове спалучаюцца два варыянты адной культуры: расійскамоўнай гарадской і беларускамоўнай вясковай. Традыцыйная культура і культура гарадская ўтвараюць глебу да ўзнікнення іншай ступені „змешвання" – „мяшанага" свету. Працэсам „змешвання" спрыяе блізкароднасць моў, сістэмы якіх дазваляюць узаемапраніканне.[40]

Ірына Будзько звяртае ўвагу на змены, якія заўважаюцца на Магілёўшчыне ў параўнанні з картамі пачатку XX ст., на якіх бранскія і смаленскія гаворкі падаваліся як беларускія. Сёння на ўсходняй Магілёўшчыне маем ужо дачыненне з пераходнымі гаворкамі. На пераходную сістэму гаворкі накладаюцца элементы расійскае мовы, прысутнай ва ўсіх сферах жыцця Беларусі. Такім чынам у пераходнай моўнай сістэме пад уздзеяннем грамадскіх фактараў паяўляюцца элементы „мяшанай" мовы. „Новай мовай" на беларуска-расійскім памежжы з'яўляецца „трасянка".[41]

Ступень насычанасці „трасянкі" элементамі другой мовы толькі ў нязначнай ступені залежыць ад арэальнага чынніка, таму што ў маўленні адзінкі тэрыторыя акрэслівае дыялектны субстрат, тым часам русіфікацыя ідыялекту звязаная з пазнейшай, г.зн. суперстратавай экспансіяй расійскае мовы на камунікатыўную практыку чалавека.

Найважнейшыя рысы трасянкі:

- карыстаецца ёю насельніцтва з базавай ці няпоўнай сярэдняй адукацыяй;
- носьбіты трасянкі актыўна карыстаюцца толькі трасянкай;
- асобы, якія размаўляюць на трасянцы, не выбіраюць мовы, не пераключаюць моўных кодаў і не думаюць пра моўную чысціню ці правільнасць расійскае

[38] E. Smułkowa, *Wokół pojęcia pogranicza. Wschodnie i zachodnie pogranicze Białorusi w ujęciu porównawczym*, [w:] *Pogranicza Białorusi w perspektywie interdyscyplinarnej,* Warszawa 2007, c. 11.

[39] *Ibidem.*

[40] Т. Іванова, *„Мяшаная мова" – „мяшаны свет"*, [w:] *Pogranicza Białorusi…*, с. 225–229.

[41] І. Будзько, *Лінгвістычны і сацыялінгвістычны характар беларускага памежжа. Да пастаноўкі праблемы*, [w:] *Pogranicza Białorusi…*, с. 265–266.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

альбо беларускае мовы (таму ў іх маўленні няма з'явы звышправільнасці), яны размаўляюць так, як умеюць.[42]

Падчас даследавання „трасянкі" асноўнае пытанне датычыць сістэмнасці – трэба параўноўваць ейныя элементы не з беларускай літаратурнай мовай, а толькі з дыялектнай нормай, тыповай для гаворкі рэспандэнта; у выпадку расійскае мовы параўнанне з літаратурнай нормай будзе апраўданае.[43]

На ступень інтэрферэнцыі ўплывае тэматыка размовы: апавядаючы, напрыклад, аб працы на сельскай гаспадарцы рэспандэнт патрапіць абмежавацца лексічнымі рэсурсамі роднае гаворкі, затое апісваючы калгаснае жыццё, калектывізацыю вёскі мусіць адклікацца да новых моўных сродкаў, таму варта праводзіць даследаванні, якія паказвалі б мову рэспандэнта ў залежнасці ад тэматыкі.[44]

На сённяшні дзень складана акрэсліць вітальнасць такой памежнай з'явы, як „трасянка", таму што працэс запазычвання не можа затрымацца толькі на лексічнай сістэме. Памятаючы пра ізаморфізм моўных узроўняў, можна зарызыкаваць прагноз, што лексіка пацягне за сабою граматыку і ўжо супольна „перамогуць" фанетыку, нават калі яна не паддаецца занадта зменам. „Трасянка" – гэта дынамічны працэс замены адной моўнай сістэмы на другую, гэта перад усім вынік грамадскіх умоў, а не моўных (у адрозненне ад такіх паняццяў, як мова мяшаная ці пераходная), гэта вынік сутыкнення не так дзвюх моўных сістэмаў, колькі двух грамадскіх з'яў – горада і вёскі, вынік адаптацыі вясковага жыхара да „больш культурных" звычаяў, умоў працы і моўных метадаў.[45]

Асноўныя прычыны „змешвання" моў на беларуска-расійскім памежжы:

- расійскі культурны ўплыў, а асабліва ўздзеянне расійскае мовы;
- як мовы навучання ў школах;
- дзяржаўная палітыка, якая дапускае дзе мовы навучання;
- уплыў СМІ;
- мова палітычных эліт як прыклад, які ідзе „зверху".[46]

Моўная сітуацыя на беларуска-расійскім памежжы па-рознаму прадстаўляецца ў залежнасці ад пакалення. Найстарэйшае пакаленне, народжанае перад Другой сусветнай вайной, аднамоўнае – найчасцей карыстаецца мясцовай гаворкай, акрэсленай як „мяшаная мова", а беларускую літаратурную мову ведае пасіўна. Асобы, народжныя пасля вайны, таксама найчасцей аднамоўныя, хаця здараецца, што мяняюць моўны код у залежнасці ад тэмы размовы; таксама карыстаюцца гаворкай, але ў ёй значна больш русізмаў. Наймаладзейшае пакален-

[42] Н. Мечковская, *Трасянка в континууме белорусско-русских идиолектов. Кто и когда говорит на трасянке?*, [w:] *Pogranicza Białorusi…*, с. 55–56.

[43] І. Будзько, *Лінгвістычны і сацыялінгвістычны характар беларускага памежжа…*, с. 266–267.

[44] *Ibid*., с. 262.

[45] *Ibid*., с. 279.

[46] J. Getka, *„Po naszemu" – charakterystyka świadomości językowej mieszkańców pogranicza białorusko-rosyjskiego*, [w:] *Pogranicza Białorusi…*, с. 286–287.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

не, падобным чынам як найстарэйшае, таксама аднамоўнае, але гэта ўжо іншая мова – рэгіянальны від расійскае мовы з элементамі гаворкі.[47]

З перспектывы часу бачны пераход ад аднамоўя (беларуска-расійскай пераходнай гаворкі), праз двухмоўе (мяшаная гаворка і мясцовая расійская мова) ізноў да аднамоўя (мясцовай расійскай мовы). У дыяхронным аспекце можна гаварыць аб пераходзе чарговых пакаленняў ад беларускай гаворкі да расійскае мовы. Адыход ад дыглосіі ў бок білінгвізму ці шматмоўя вядзе да змены мовы на карысць дзяржаўнай, мацнейшай (у гэтым выпадку расійскай). Захаванню беларускае гаворкі не спрыяе генетычная блізкасць абедзвюх сістэмаў (гаворкі і расійскай мовы), а таксама тэндэнцыі ў функцыянальнай дыстрыбуцыі моў (расійская ахапіла чарговыя сферы жыцця, таксама сямейную.[48]

2.4. Польска-беларуска-ўкраінскае памежжа

Поўдзень Беларусі вельмі разнародны – паўднёва-ўсходнія тэрыторыі і паўднёва-заходнія істотна адрозніваюцца. На беларускім заходнім Палессі (частка Брэсцкай вобласці) маем дачыненне з гаворкамі тыпова ўкраінскімі, а на паўднёвым усходзе (тэрытарыяльныя даследаванні вяліся на Мазыршчыне ў Гомельскай вобласці) пераходных гаворак трэба было б шукаць далей на поўдзень, на Чарнігаўшчыне, значыць у межах Украіны, дзе выступаюць тыповыя рысы беларускае мовы, уключна з аканнем.[49]

Гэты факт знайшоў сваё адлюстраванне на мапе Я. Карскага, дзе моўная беларуска-ўкраінская мяжа была вызначана наступным чынам: па рацэ Нараў праз Бельскі павет да Белавежскае пушчы, затым на Шарашова, адкуль накіроўваецца на ўсход, на поўнач ад Пружан да ракі Ясельда, амаль да Картуз-Бярозы, а затым, ахопліваючы Стрычаў, да ракі Шчары. Ад Шчары мяжа праходзіць у паўднёва-ўсходнім накірунку да мясцовасці Лунін непадалёк ад Лунінца, затым да ракі Прыпяць і па Прыпяці праз Мазырскі і Рэчыцкі раёны да Дняпра, і далей па Дняпры да Любеча на Чарнігаўшчыне, адкуль праз раёны Новазыбкаўскі і Сасніцкі накіроўваецца да Дзясны і па Дзясне да Арлоўскай вобласці.[50]

Некаторыя рысы гаворак паўднёва-ўсходняга Палесся выходзяць па-за межы Беларусі і выступаюць на Украіне ды на Браншчыне, а гаворкі брэсцка-пінскага Палесся маюць свой працяг на тэрыторыі Падляшша. Гэта перыферыйныя гаворкі, у якіх выступае шмат архаізмаў.

Гаворкі паўднёва-ўсходняе зоны і мазырская група займаюць усходнюю частку паўднёва-заходняга дыялекту, а таксама часткова цэнтральныя гаворкі і паўд-

[47] M. Jankowiak, *Zakres funkcjonowania języka białoruskiego i stan zachowania gwary na przykładzie wybranych miejscowości w okolicach Horek w obwodzie mohylewskim*, [w:] *Pogranicza Białorusi…*, c. 296–301.

[48] *Ibid*., c. 313.

[49] E. Smułkowa, *Wokół pojęcia pogranicza…*, c. 12.

[50] Е. Ф. Карский, *Белоруссы*, т. 1, Минск 2006, с. 550–551.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

нёва-ўсходнюю частку паўночна-ўсходняга дыялекту. Многія рысы ў параўнанні з астатняй тэрыторыяй Беларусі ўтвараюць познія інавацыі:

• наяўнасць цвёрдага зычнага на канцы асновы ў 1 асобе множнага ліку дзеясловаў I спражэння незалежна ад месца націску (*н'ас'ом, п'ойдам*), а таксама пасля заднеязычных *г, к* (*стрыг'ом, п'ак'ом*);

• форма інфінітыва на *-ці* пасля заднеязычных *г, к* (*стр'ыгц'і, п'акц''і*);

• форма *йо* ў 3 асобе адзіночнага ліку дзеяслова *быць*;

• наяўнасць *у* на месцы *ы* пасля губных зычных (*бук, каб'ула, му, ву*);

• наяўнасць ненаціскнога *е* ў давальным склоне множнага ліку назоўнікаў з мяккай асновай (*кан'опл'ем, в''ішн'ем*).[51]

Няма сумненняў, што кожны кантакт паміж гаворкамі, якія належаць да розных этнічных моў, вядзе да большага ці меншага (у залежнасці ад характару кантакту) змешвання элементаў, характэрных кожнай з моў. Калі такі кантакт здзяйсняўся ў адпаведных фізіяграфічных, палітычных і рэлігійных умовах, то змешванне было інтэнсіўным і ахоплівала шырокую паласу суседніх гаворак.[52]

Несумненна, найхутчэй пранікае лексіка, таму ў перыферыйных гаворках выступае значная колькасць сінонімаў і структурных дублетаў. Не прычыняецца гэта аднак да сур'ёзных якасных зменаў у гэтых сістэмах. Змены такія выклікае пранікненне істотных фанетычных рыс. Як адзначае Міхал Саевіч, пранікненне з украінскае гаворкі ў беларускую такой рысы, як цвёрдае вымаўленне зычных перад *е*, адразу стаўляе пад пытальным знакам беларускасць гэтае гаворкі.[53] Аўтар лічыць, што ў выпадку змешвання старых, сістэмных рыс, якія ў мінулым вырашалі пра ўзнікненне на канкрэтнай тэрыторыі асобнае мовы, у сістэме перыферыйнай гаворкі могуць адбыцца сур'ёзныя якасныя змены, а нават змена яе моўнай прыналежнасці.[54]

Прыклады беларуска-ўкраінскіх гібрыдных мікратапонімаў з Падляшша (*Horoż''iska, Verxkryn''ica, Zver'yn'ec*) з'яўляюцца доказам наяўнасці ў адной лексеме некалькіх рыс, характэрных для беларускай і ўкраінскай моў, таму немагчыма адназначна заквалiфікаваць гэтыя лексемы да адной з дзвюх моў. У такой сітуацыі гаворым аб пераходнасці гаворкі. Пераходныя гаворкі – гэта гаворкі, размешчаныя паміж выразнымі дыялектнымі масівамі той самай, альбо прынамсі дзвюх асобных моў, адназначнае аб'ектыўнае заквалiфікаванне якіх да аднаго з суседніх дыялектаў (моў) натыкаецца на вялікія цяжкасці альбо ўвогуле немагчымае з увагі на паступовае тэрытарыяльнае павелічэнне характэрных рыс, наяўнасць якіх вырашае аб прыналежнасці гаворкі да акрэсленага дыялекту альбо мовы.[55]

---

[51] *Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак…*, с. 246–249.

[52] M. Sajewicz, *Derywacja sufiksalna osobowych nazw subiektów w nadnarwiańskich gwarach białoruskich Białostocczyzny. Deverbativa deadiectiva*, Lublin 2002, c. 33.

[53] Idem, *O białorusko-ukraińskiej granicy językowej na Białostocczyźnie*, „Rozprawy Slawistyczne" 12, Lublin 1997, c. 98.

[54] *Ibid*., c. 98–99.

[55] E. Smułkowa, *Propozycja terminologicznego zawężenia zakresu pojęć: „gwary przejściowe" – „gwary mieszane"*, [w:] eadem, *Białoruś i pogranicza*…, c. 350.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 28/11/2026 03:22:55

У адрозненне ад змешвання моў, пераходнасць вынікае з працяглага супольнага развіцця гаворкі на стыку блізкароднасных моў; мяшаныя ідыялекты могуць паўставаць усюды там, дзе прэстыж адной з моў і утылітарызм прычыняюцца да ўзнікнення білінгвізму, альбо – у яго выніку – да поўнага пераходу на другую мову, якая пачынае ўсё лепш прысвойвацца.[56]

Комплекснасць праведзеных даследаванняў, не абмяжоўванне толькі сінхронным вопісам з'яў, але таксама паказанне гістарычных абумоўленасцяў дае поўны вобраз памежжаў Беларусі як тэрыторыі, дыферэнцыяванай грамадска, гістарычна, культурна і моўна. Несумненна, карысна было б правесці такія даследаванні таксама на памежжах краін-суседак Беларусі.

Некаторыя перыферыйныя гаворкі, а асабліва іх прыналежнасць да канкрэтнае мовы ўвесь час выклікаюць дыскусіі, якія аднак вядуцца на аснове сінхронных даследаванняў, што недастаткова для адназначнага заквалiфікавання іх да канкрэтнае мовы.[57] Дзеля гэтага неабходна карыстацца таксама метадамі гістарычна-параўнаўчага моўнаведства.

Summary

Belarusian dialects are in the neighborhood of Baltic dialects – West- and east-Slavonic, thereby creating zones of mixed or transitional dialects in the borderland and entering new mutual contacts every day at different social and language levels. Because of different situations in the central area and in borderland zones, new tendencies in Belarusian dialects are shown in the following order: 1. new tendencies in the central Belarusian area, 2. new tendencies in dialects in Belarus' border area. The central dialectal area played a special role in the codification of Belarusian. The dialectal features of this area are of distinct local origin as a result of mutual impacts and contaminations with peculiarities from various Belarusian dialects within this central zone rather than the outcome of development and separation from other Belarusian dialects as a consequence of contacts with dialects of the neighboring languages. In the border area the processes of language convergence are observable. In diachronic terms we can speak of the transition of next generation from the Belarusian dialect to the Russian language..

[56] Eadem, *Pojęcie gwar przejściowych i mieszanych na polsko-białorusko-ukraińskim pograniczu językowym*, [w:] eadem, *Białoruś i pogranicza*…, c. 344.

[57] K. Dejna, *Językowa przynależność gwar brzesko-pińskich*, [w:] *Języki i literatury wschodniosłowiańskie*, Łódź 1976, c. 19.